**ДА 70-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ НАРОДНАГА ПІСЬМЕННІКА БЕЛАРУСІ ІВАНА ПЯТРОВІЧА ШАМЯКІНА**

# ШЧОДРЫ ТАЛЕНТ

У канцы студзеня адбудзецца юбілей пісьменніка, нашага земляка, без творчасці якога нельга зразумець сучасны стан развіцця нацыянальнай літаратуры, асабліва яе прозы. Гэта 70 гадоў з дня нараджэння Івана Пятровіча Шамякіна — народнага пісьменніка БССР, Героя Сацыялістычнай Працы, лаўрэата дзяржаўных і літаратурнай прэміі імя Я. Коласа, аўтара шматлікіх аповесцей, раманаў, публіцыстычных, літаратурна-крытычных артыкулаў, кінасцэнарыяў, драматычных твораў, дзяржаўнага дзеяча, вялікага працаўніка на ніве беларускай культуры.

Жыццё, грамадская, працоўная дзейнасць І. Шамякіна тыповыя для пакалення людзей, да якога ён належыць. Дзяцінства правёў у сялянскай сям'і. Бацькі будучага пісьменніка Пётр Мінавіч і Санклеція Сцяпанаўна, дзед Міна, шматлікія родзічы ведалі цану хлеба і зямлі, шмат зрабілі для таго, каб наша радзіма была магутнай і багатай. Як адзначаў потым І. Шамякін, там знаходзіцца адзін з самых магутных вытокаў ягонай творчасці (кнігі роздумаў і ўспамінаў «Размова з чытачом», «Карэнні і галіны»).

Да сваёй радзімы, Гомельшчыны, пісьменнік звяртаецца ў шматлікіх сваіх раманах, аповесцях («Глыбокая плынь», «Сэрца на далоні», «Крыніцы», пенталогія «Трывожнае шчасце», «Вазьму твой боль», «Шлюбная ноч», «Першы генерал», «Бронецягнік «Таварыш Ленін» і г. д.).

У дзіцячыя і юнацкія гады ён палюбіў краявіды Гомельшчыны, сціплы і працавіты беларускі люд, сустрэўся з сапраўднай літаратурай. Бацька прынёс аднойчы дамоў кніжку, якую чытаў з сябрамі-леснікамі. Гэта была паэма Якуба Коласа «Новая зямля». Яна зачаравала прысутных і, канешне, малога Івана шчырым і праўдзівым словам аб жыцці сям'і Міхала. Усё сказанае Коласам у паэме было вельмі блізкім і дарагім.

Пасля заканчэння сямігодкі і праз некаторы час Гомельскага тэхнікума мясцовых матэрыялаў І. Шамякін быў прызваны ў Чырвоную Армію. Тут у 1941 годзе сустрэў будучы пісьменнік пачатак Вялікай Айчыннай вайны. На заканчэнне ўсенароднага змагання з фашызмам прыпадае і пачатак літаратурнай дзейнасці. Канец 1944 года — апавяданне на роднай мове «У снежнай пустыні», якое пазней было надрукавана ў часопісе «Полымя», а таксама аповесць «Помста» (1945). Гэтыя творы сведчылі аб прыходзе ў літаратуру аўтара, які пачынаў асэнсоўваць падзеі нядаўняй вайны. У наступныя гады быў напісаны раман «Глыбокая плынь» (1949), матэрыялам для якога паслужылі ўспаміны блізкіх і родных пісьменніка аб партызанскім змаганні на Гомельшчыне. За гэты вялікі эпічны твор І. Шамякін быў удастоены Дзяржаўнай прэміі СССР.

Канец 40-х — пачатак 50-х гадоў былі для І. Шамякіна, як і для многіх савецкіх пісьменнікаў, цяжкімі: грамадскае, сацыяльнае, эканамічнае жыццё знаходзілася пад велізарным ціскам бюракратычна-адміністрацыйнай сістэмы, вянцом якой быў культ Сталіна, зацвіла кветкамі так званая «тэорыя» бесканфліктнасці. Многія мастакі слова шукалі тэмы для сваіх твораў не ў сучаснасці, а ў мінулым. Толькі найбольш таленавітыя адважваліся падымаць востраканфліктныя праблемы жыцця. У 1949 годзе ўбачыў свет зборнік апавяданняў І. Шамякіна «На знаёмых шляхах», а затым зборнік «Дзве сілы» (1951). Лепшым апавяданням указаных кніжак уласціва вострае адчуванне працэсаў тагачаснага грамадскага жыцця, сацыяльных, маральна-этычных праблем, паказ характару чалавека праз дачыненне да народных інтарэсаў. Жыццё калгаснага сялянства і вясковай інтэлігенцыі ў першыя пасляваенныя гады вызначаюць змест рамана «У добры час» (1953), у якім нават ва ўмовах панавання «тэорыі» бесканфліктнасці празаік змог улавіць здаровыя тэндэнцыі жыцця савецкіх людзей.

Адметнай з'явай развіцця нацыянальнай літаратуры сталі раман «Крыніцы» (1956), а таксама зборнік апавяданняў І. Шамякіна «Першае спатканне». Гэта творы, напісаныя ў духу ідэй будучага XX-га з'езда КПСС, які развянчаў валюнтарысцкія метады кіраўніцтва эканомікай, палітычным жыццём народа.

Канец 50-х і першая палова 60-х гадоў былі для І. Шамякіна часам творчага ўздыму, настойлівых пошукаў. Была напісана большая частка аповесцей, якія пазней склалі пенталогію «Трывожнае шчасце», («Непаўторная вясна», «Начныя зарніцы», «Агонь і снег», «Пошукі сустрэчы», «Мост»). Тры з іх мелі вялікі поспех у тагачаснага чытача і да гэтага часу з'яўляюцца прадметам вывучэння ў нацыянальнай школе.

Пачынаючы з 60-х і канчаючы 70-мі гадамі, І. Шамякін шмат сіл і намаганняў аддае працы ў Саюзе пісьменнікаў БССР, дзе працуе сакратаром, а потым і першым сакратаром СП. Доўгі час з'яўляецца Старшынёй Вярхоўнага Савета БССР, членам ЦК КПБ, шмат ездзіць па рэспубліцы, сустракаецца з чытачамі, цікавіцца важнейшымі працэсамі тагачаснага жыцця. На гэтыя гады прыпадае пік ягонай творчай дзейнасці. У 1961 г. выходзіць з друку зборнік апавяданняў «Матчыны рукі», у 1963 — раман «Сэрца на далоні», пазней адзначаны Дзяржаўнай прэміяй імя Я. Коласа; у 1968 — зб. апавяданняў і аповесцей «Вячэрні сеанс» і раман «Снежныя зімы». У 1966 годзе закончана вялікая праца па падрыхтоўцы і выпуску збору твораў у 5-ці тамах, у якім падсумоўвалася шматгадовая работа пісьменніка ў літаратуры.

Значны ўклад І. Шамякіна ў распрацоўку ленінскай тэмы. Так, у аповесцях «Лёс майго земляка» (Першы генерал») і «Бронецягнік «Таварыш Ленін», кінааповесць «Эшалон у Германію» («Хлеб пахне порахам») вядучай з'яўляецца героіка-рэвалюцыйная тэматыка, цікавасць да гістарычнага мінулага нашага народа, што пазней знайшло сваё выйсце ў вялікім эпічным творы «Петраград—Брэст».

Даволі актыўна працуе І. Шамякін у галіне драматургіі. Ён — аўтар вострасюжэтных п'ес «Не верце цішыні», «Дзеці аднаго дома», «Выгнанне блудніцы», «Экзамен на восень», тэлесцэнарыяў па матывах «Трывожнае шчасце», «І змоўклі птушкі». Вядома, што вялікіх поспехаў у галіне драматургіі І. Шамякін не меў. Талент яго эпічнага характару. Аднак п'есы яго былі ў свой час пастаўлены ў тэатрах рэспублікі і ў значнай ступені садзейнічалі выхаванню дарослых і дзяцей. І гэта ў той час, калі нацыянальная драматургія толькі-толькі рабіла першыя крокі ў пераадоленні «тэорыі» бесканфліктнасці, у зеніце славы знаходзіўся другі наш зямляк — народны пісьменнік БССР Андрэй Макаёнак, слаўны юбілей якога адзначаны творчай інтэлігенцыяй у канцы мінулага года.

І. Шамякіна заўсёды цікавілі праблемы развіцця нацыянальнага мастацтва. У 60—70 гады былі напісаны значныя творы, якія з поўным правам прынеслі І. Шамякіну шырокую вядомасць не толькі ў нашай краіне, але і далёка за яе межамі. Былі апублікаваны раманы «Атланты і карыятыды», «Вазьму твой боль», «Зеніт», аповесці «Шлюбная ноч», «Гандлярка і паэт». Шырокі грамадскі рэзананс атрымалі кнігі ўспамінаў і літаратурна-крытычных артыкулаў «Размова з чытачом», «Карэнні і галіны».

У 1963 годзе І. Шамякін наведаў ЗША ў складзе беларускай дэлегацыі на XVIII сесіі Генеральнай Асамблеі ААН, пабываў у іншых краінах свету. І заўсёды свае ўражанні аб паездках занатоўваў і потым публікаваў, дзе выказваў свае погляды на замежнае жыццё, параўноўваў, хваліў або крытыкаваў.

Не забываў пісьменнік і сваёй радзімы, тых мясцін, якія сфарміравалі яго як чалавека, у вялікай ступені паўплывалі на ягоную творчасць. Часта сустракаецца з землякамі ў вёсцы Карма Добрушскага раёна, навучэнцамі мясцовай школы, студэнтамі і выкладчыкамі Гомельскага дзяржуніверсітэта імя Ф. Скарыны. Не без яго актыўнага ўдзелу была створана навуковая лабараторыя пры кафедры беларускай мовы па вывучэнню спадчыны Скарыны, а затым і музей. У час такіх сустрэч І. Шамякін вельмі грунтоўна і зацікаўлена апавядаў аб сваіх творчых планах, гаварыў пра найбольш значныя дасягненні нацыянальнай і айчыннай прозы, драматургіі, паэзіі, адказваў на пытанні слухачоў.

У апошнія гады наш зямляк шмат сіл і намаганняў аддае вельмі важнай і адказнай рабоце. Ён з'яўляецца галоўным рэдактарам Беларускай савецкай энцыклапедыі імя П. Броўкі, якая шмат зрабіла для стварэння грунтоўных даведнікаў у многіх галінах нашага жыцця.

Жыццё і творчасць, грамадская дзейнасць І. Шамякіна з'яўляюцца прыкладам служэння людзям і сапраўднаму мастацтву.

**Ул. КАВАЛЕНКА,**
дацэнт кафедры беларускай літаратуры.

---

сакрэтам, што любыя грамадскія фарміраванні ў нашым грамадстве ў азначанай ступені і азначаны перыяд часу капіравалі стыль і метады кіраўніцтва савецкіх, партыйных і дзяржаўных органаў, поўнасцю падпарадкоўваліся іх волевыяўленню. Так было. Але разам з тым у тых жа грамадскіх арганізацый, у прыватнасці, прафсаюзаў было і іншае жаданне — стаць незалежным і, перш за ўсё, у рашэнні пытанняў сацыяльнай абароны. Гэта жаданне ажыццяўляецца, на жаль, даволі цяжка. Ёсць шмат прычын як аб'ектыўнага, так і суб'ектыўнага характару.

У рабоце прафкома я ўдзельнічаю з 1984 года, а штатным работнікам з'яўляюся з 1988 г. За сем гадоў працы ў прафкоме бачу як прынцыпова змянілася пазіцыя прафсаюзнага камітэта па рашэнню многіх пытанняў жыццядзейнасці нашай ВНУ. Так, Валерый Паўлавіч, мы не змаглі адстаяць усімі паважанага Пятра Аляксеевіча, але не таму, што спалохаліся ціску адміністрацыі, а таму, што згодна з арт. 33 п. 11 КЗаП БССР працоўны дагавор адміністрацыі з ім быў скасаваны на падставе «дасягнення работнікам пенсійнага ўзросту пры наяўнасці права на поўную пенсію па старасці». У прафкоме не было ніякай падставы ў адмове на прадстаўленне адміністрацыі па звальненню П. А. Савінскага. Дарэчы, гэта добра разумеў і сам Пётр Аляксеевіч, з якім у мяне асабіста да гэтага часу захаваліся цёплыя і добрыя адносіны.

Што ж датычыцца размеркавання пуцёвак, то перш, чым штосьці размеркаваць, трэба гэта стварыць. Заключэнне дагавораў — гэта заўсёды здзелка, якая павінна быць выгаднай для абодвух бакоў. Выдаючы пуцёўкі на летні час, нам прапаноўвалі іх і не на вельмі зручныя тэрміны (вясной і восенню). Аднак у выніку карпатлівай работы, зробленай камісіяй па выкарыстанню ФСР і прафкомам, удалося без страт размеркаваць практычна ўсе пуцёўкі, набытыя за лік фонду сацыяльнага развіцця, у адрозненні ад арганізацый, страціўшых у мінулым годзе ад нерэалізацыі пуцёвак дзесяткі тысяч рублёў. Таму, натуральна, былі супрацоўнікі, якім пуцёўкі выдаваліся як ў 1989 годзе, так і ў 1990 г. Дарэчы, спісы супрацоўнікаў універсітэта, атрымаўшых пуцёўкі як за сродкі сацыяльнага страхавання, так і за кошт фонда сацыяльнага развіцця па ініцыятыве прафкома друкуюцца ў газеце «Гомельскі універсітэт». І тут, Валерый Паўлавіч, не трэба «фактыкі» падтасоўваць пад факты. На вашу фразу: «Паглядзіце ў спісы і вы ўбачыце, што большасць членаў прафкома атрымалі пуцёўкі ў добрыя месцы або за мяжу», хочацца адказаць наступнае. Па-першае, прафкомам ужо даўно не выдзяляюцца пуцёўкі для паездкі за мяжу, а таму намі яны і не размяркоўваюцца. Зараз існуе адносна вялікая колькасць арганізацый, якія займаюцца рэалізацыяй такіх пуцёвак. І тут справа ў асабістай ініцыятыве супрацоўнікаў універсітэта. Па-другое, чаму член прафкома, губляючы свой асабісты час, здароўе, адрываючы сябе, іншы раз надоўга, ад дамашніх спраў, павінен быць пазбаўлены права на атрыманне пуцёўкі? І ці так ужо багата атрымана пуцёвак членамі прафкома? ФСР 1989 г. — 4 чал., ФСР 1990 г. — 5 чал., за кошт сацстрахавання 1989 г. — 3 чал., 1990 г. — 2 чал. Нагадаю, што колькасны састаў прафкома вагаўся ад 26 да 28 чалавек. Дарэчы, ездзілі члены прафкома ў асноўным у тыя ж месцы, што і іншыя супрацоўнікі універсітэта, у чым можна ўпэўніцца з публікуемых намі спісаў.

Размеркаванне аўтамашын заўсёды было і, на жаль, застаецца «ахілесавай пятой» у рабоце як прафкома, так і адміністрацыі. Аднак за апошні год, як нам здаецца, удалося выпрацаваць адносна справядлівы механізм размеркавання аўтамашын. Аб гэтым нядаўна пісалася ў нашым друку і таму няма сэнсу паўтарацца. Што датычыцца названых прозвішчаў, то галоўны бухгалтар І. А. Курава і прарэктар па капітальнаму будаўніцтву С. А. Калацільшчыкаў як раз падыходзяць пад азначэнне «перадавік вытворчасці». Падраздзяленне, узначальваемае І. А. Куравай, неаднаразова з'яўлялася пераможцам у сацспаборніцтве сярод ВНУ рэспублікі, па ранейшаму месцу работы падзякамі і заахвочваннямі адзначан С. А. Калацільшчыкаў, які быў запрошаны намі ва універсітэт. Дарэчы сказаць, апошняму даводзіцца шмат выязджаць на асабістым аўтатранспарце за межы вобласці і рэспублікі па рашэнню пытанняў будаўніцтва. Менавіта гэтымі меркаваннямі кіраваўся прафком пры выдзяленні аўтамашын вышэй адзначаным супрацоўнікам універсітэта. Што датычыцца прозвішча Г. В. Саннікавай, то хацелася б пажадаць Вам, В. П. Дзядзічкін, заваяваць такі ж аўтарытэт і павагу, які здабыла Ганна Васільеўна, адна са старэйшых супрацоўнікаў універсітэта, ветэран працы, на якога таксама распаўсюджана пастанова Саўміна СССР ад 1982 г. (а не ад 1980 г.).

Што датычыцца пацвярджэння аб выдзяленні машын для дзяцей, то гэта, прабачце мяне, на ўзроўні радавых плётак і не робіць Вам гонару. А цяпер адносна Вас. Улічваючы, што ў 1979 годзе Вам ужо выдзялялася праз універсітэт аўтамашына ВАЗ-2106, то прафком, напэўна, па гэтай прычыне не падтрымаў Вашу кандыдатуру пры апошнім размеркаванні машын у снежні мінулага года.

Не лічу патрэбным апраўдвацца перад фактамі, прыведзенымі В. П. Дзядзічкіным у сваім артыкуле. На пытанні, якія датычацца атрымання мною кватэры і аўтамашыны, на прафсаюзнай канферэнцыі з майго боку быў дадзены падрабязны адказ. Думаю, ён задаволіў большасць прысутнічаючых, якія ў канчатковым выніку не падтрымалі прапанову Валерыя Паўлавіча выказаць недавер мне як старшыні і ўсяму прафкому ў цэлым.

У заключэнне адна заўвага: чаму, Валерый Паўлавіч, Вы ўвесь час гаворыце аб нейкай пастаяннай небяспецы для Вас, нападках, падкопах і г. д. Ваша дзейнасць ва універсітэце працякала адносна ўдала: работа загадчыкам кафедры, абарона доктарскай дысертацыі, атрыманне 4-пакаёвай кватэры, аўтамашыны, вылучэнне на вучонае званне прафесара і г. д. А калі бастуюць студэнты па прычыне чытаемых курсаў на Вашай кафедры, то гэта не нападкі, а сур'ёзнейшы факт, над якім трэба задумацца, і, магчыма, менавіта туды накіроўваць сваю энергію і намаганні.

**У. ПЕНЯЗЬ,**
старшыня прафкома ГДУ.

---

**Ад рэдакцыі:** спадзяемся, што чытачы нашай газеты адклікнуцца на гэтыя абедзьве публікацыі, і іх водгукі мы апублікуем.

